РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА "Рух "За Свабоду". Выпуск № 11 лістапад 2011

**Актывіст гатовы ўзброіцца снайперскай вінтоўкай – с.2**

**Алесь Бяляцкі: "Быццам вярнуўся ў Савецкі Саюз" – с.3**

**Расійскія мільярды на АЭС – с.5**

**Еўраклубы – дзверы ў Еўропу – с.6**

**Рэформы ў сістэме ВНУ – с.7**

# "План Маршала" супраць Еўразійскага саюза

**Новы цыкл наладжвання стасункаў паміж афіцыйным Мінскам і Крамлём – што гэта? Чарговыя антыкрызісныя манеўры Лукашэнкі ці незваротная здача суверэнітэту?**



WWW.NATO.INT

**У еўракамісара па пытаннях пашырэння і палітыкі суседства Штэфана Фюле адносна Беларусі ёсць план**

Бо, з аднаго боку, мы выдатна бачылі, якім пшыкам сталася так званая Саюзная дзяржава, а з іншага – Беларусь гэтым разам не проста апынулася ў чарговым неаімперскім праекце, якім ёсць Еўразійскі саюз, а беспрэцэдэнтна аддала газатранспартную сістэму, важную артэрыю эканомікі.

У любым выпадку Масква пасля падзеяў 19 снежня 2010 года правяла чарговую аперацыю па адсяканні нашай краіны ад Еўропы і ўмацавала ўладныя пазіцыі Аляксандра Лукашэнкі.

Крэмль не хавае, што будуе новы цэнтр сілы ў процівагу Еўрасаюзу.

Як праграмна заявіў **Дзмітрый Мядзведзеў** на з'ездзе партыі ўлады "Адзіная Расія", "*новы саюз прынясе не проста адчуванне нашай геапалітычнай велічы (што, вядома, таксама важна), але ён прынясе выгады, карысць кожнай расійскай сям'і, таму што павысіць наш эканамічны патэнцыял, дасць нам магчымасць умацаваць міжнароднае становішча Расіі на сусветнай арэне. А гэта становішча, і мы з вамі ведаем, яно было заслужана працай велізарнай колькасці людзей на працягу многіх стагоддзяў*".

Беларусь атрымае на 2012 год ад Расіі газавую інтэграцыйную зніжку, а да 2014 года выйдзе на роўнадаходныя кошты. "*На наступны год пры сярэдняй планаванай цане прыкладна каля 400 долараў для еўрапейскіх спажыўцоў Беларусь будзе плаціць нам у першым квартале 165 долараў з тысячы кубоў*", – кажа **Уладзімір Пуцін**.

Гэтае параўнанне адмыслова акцэнтаванае: Беларусь аддзеленая ад Еўропы. Гэтая ўгода "эканамічныя льготы за змену геапалітычнай арыентацыі" дэманструе захаванне Беларусі ў сферы ўплыву Масквы.

На гэтым фоне жорсткія заходнія санкцыі, якіх з інерцыйнага ў лепшым выпадку радыкалізму патрабуюць некаторыя апазіцыйныя сілы ў нашай краіне, глядзеліся б паразна. На карысць Расіі. Бо пуга не толькі не ўцягвае ў еўраінтэграцыю беларускія ўлады, але і можа негатыўна адбіцца на праеўрапейскіх настроях беларусаў, якія за апошнія гады зраўняліся па электаральнай маштабнасці з прарасійскасцю.

Еўрасаюз слушна рыхтуе своеасаблівы "план Маршала" для Беларусі. Яго, як чакаецца, у снежні прэзентуе еўракамісар па пытаннях пашырэння і палітыкі суседства **Штэфан Фюле**. Пытанне ў тым, ці будзе ён прыцягальным і пры гэтым рэальным?

**Працяг на с.4**

## Усе беларусы станушь мільянерамі

Гэтак анекдатычна станецца пасля павышэння з хуткім часе мінімальнага заробку.

"*Урад вызначыўся, каб у наступным годзе не было ў краіне заработнай платы менш за мільён рублёў*", – сказаў віцэ-прэмьер **Сяргей Румас**.

Мільянершамі стануць і даяркі фермы "Хаціслаў" у Маларыцкім раёне, якія нядаўна выпатрабавалі ў начальства заробак на 28% большы, чым раней.

Пасля бунту заробак даярак павысіўся да... 800 тысяч рублёў.

Гэта змусіла згадаць заявы Лукашэнкі, што даяркі ў нас зарабляюць 600 долараў.

## Рэальнае беспрацоўе

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя складае цяпер паводле Белстату 0,6% ад эканамічна актыўнага насельніцтва.

Як высветлілася, па выніках перапісу насельніцтва ў 2009 года, была атрыманая значная большая лічба беспрацоўных беларусаў – 6,1%.

І цяпер узровень беспрацоўя будзе вылічвацца двума метадамі – паводле зарэгістраваных выпадкаў і ўлічваючы даследаванне хатніх гаспадарак, паколькі не ўсе беспрацоўныя становяцца на ўлік на біржах працы.

Між тым, урад канстатуе іншую праблему – адток працоўнай сілы за мяжу, перш за ўсё ў Расію, дзе заробкі большыя ў некалькі разоў.

## Вільня блізка, а ехаць доўга

Павелічэнне інтэрвалу выезду за мяжу на сваіх аўто з 5 да 8 дзён аб'ёмы вывазу бензіну і дызпаліва з Беларусі істотна не зменшыла. Як і чэргі на беларуска-польскай і беларуска-літоўскай межах.

У Дзяржаўным мытным камітэце кажуць, што сёння колькасць аўтамабіляў удвая перавышае праектную прапускную здольнасць.

У выніку беларускія і літоўскія мытнікі і памежнікі "*вызначылі напрамкі далейшага ўзаемадзеяння па ліквідацыі чэргаў*". Сярод іх – перавод спрошчанага пункта пропуску "Лоша" у катэгорыю міжнароднага.

# "Дайце мне вінтоўку..."

**Гомельскі актывіст Руху "За Свабоду" Уладзімір Няпомняшчых звярнуўся з пісьмовай заявай да старшыні аблвыканкаму Ўладзімера Дворніка з просьбай залічыць у тэрытарыяльныя войскі і выдаць яму не абы-якую, а снайперскую вінтоўку, а лепш – гранатамёт.**



У заяве добраахвотнік распавёў, што натхніўся выступам галоўнакамандуючага **Аляксандра Лукашэнкі**. Той сказаў, што ядром такіх фармаванняў павінны быць бізнэсмены, якім ёсць што абараняць.

"*Я раней быў індывідуальным прадпрымальнікам (бізнэсоўцам), хаця называўся "вашывай блыхой". Сабраў капітал у беларускіх рублях, які захоўваецца ў самым надзейным банку свету – "Беларусбанку*", – фельетонна напісаў актывіст, пенсіянер Міністэрства ўнутраных справаў, гатовы даць адпор усялякім "казлам", "адмарозкам" і "пятай калоне".

Днямі Няпомняшчых атрымаў адказ ад імя начальніка аддзелу каардынацыі дзейнасці адміністрацыйных органаў і вайскова-мабілізацыйнай работы кіраўніцтва спраў Гомельскага аблвыканкаму **Ўладзіміра Краўцова**. У лісце – "*падзяка за праяўлены патрыятызм, гатоўнасць са зброяй у руках у выпадку неабходнасці абараніць суверэнітэт і незалежнасць Рэспублікі Беларусь у складзе войскаў тэрытарыяльнай абароны*".

Аднак у прызыве на службу ў тэрытарыяльныя войскі першаму добраахвотніку адмовілі, паколькі ён дасягнуў максімальна дапушчальнага ўзросту для іх – 50 гадоў і ў 2002 годзе быў зняты з вайсковага ўліку. Уладзімір Няпомняшчых кажа, што пры патрэбе згодны партызаніць з віламі.

Нагадаем, Лукашэнка падчас каманднa-штабнога вучэння па тэрытарыяльнай абароне шмат казаў мабілізацыю сілавікоў.

Міністэрству ўнутраных справаў загадана "*спыняць дзейнасць экстрэмісцкіх асобаў. Міністр унутраных справаў мусіць забыцца: прыстойна, не прыстойна, як пра нас падумаюць. Неабходна жорстка рэагаваць на любыя дзеянні. Галоўнае – забяспечыць парадак у краіне, дзеючы строга ў адпаведнасці з законам і логікаю развіцця нашага грамадства*".

А "*КДБ у нас зашмат аналізуе, ведае, дакладае. Я чакаю канкрэтных дзеянняў*". *Лукашэнка таксама параіў сілавікам не разнявольвацца, бо* "*наперадзе могуць быць няпростыя часы*".

У страху вочы вялікія...

## Закон супраць інтэрнет-рэвалюцыі

**Уступіў у сілу новы закон "Аб масавых мерапрыемствах", які пераўтварае ў куды больш жорсткія правілы правядзення апазіцыйных акцый і робіць неабмежаванымі магчымасці спецслужбаў і праваахоўных органаў.**

Так, забараняецца збіраць людзей праз інтэрнет, не ўзгадніўшы правядзенне акцыі з мясцовымі ўладамі. Дата і час яе мусіць абвяшчацца толькі пасля атрымання дазволу. А дазволы на акцыі пратэсту ў нас амаль не даюцца. Да ўсяго, арганізатарам акцый давядзецца плаціць за ахову грамадскага парадку. Мітынгі будуць агароджвацца з даглядам удзельнікаў. Мітынг у любы момант можа быць спынены, калі праваахоўнікі заўважаць у ім пагрозу для навакольных грамадзян.

# “Быццам вярнуўся ў Савецкі Саюз”

**У Беларусі стала на аднаго палітзняволенага больш – на 4,5 года з канфіскацыяй маёмасці нібыта за ўтойванне даходаў у асабліва буйным памеры засуджаны кіраўнік Праваабарончага цэнтра “Вясна”, віцэ-прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алесь Бяляцкі.**

Нагадаем, ён намінант на Нобелеўскую прэмію міру 2012 года. Калі праваабаронца ёй будзе ўганараваны, седзячы за кратамі, гэта будзе адначасова і гонар, і ганьба для Беларусі.

“*У Беларусі склалася аўтарытарная ўлада, якая не бачыць месца для праваабаронцаў у краіне*”, – сказаў у сваім апошнім слове на судзе **Алесь Бяляцкі**.

З яго словаў, ён адчувае сябе “*гэтыя апошнія тры з паловай месяцы, як быццам бы я вярнуўся ў Савецкі Саюз. І проста на нейкім іншым узроўні адбылася рэінкарнацыя ўсяго таго, што было раней*”.

Намеснік старшыні Руху “За Свабоду” **Юрась Губарэвіч** адзначае, што “*пасля прэзідэнцкіх выбараў 2010 года адбываўся разгром апазіцыйных сіл, калі дзясяткі палітычных апанентаў Лукашэнкі былі кінутыя ў турмы. Цяпер надышла чарга праваабарончых структур. Алесь Бяляцкі – адзін з самых вядомых у Беларусі праваабаронцаў, якія займаліся дапамогай палітвязням, рэпрэсаваным. Пераслед яго – спроба задушыць любыя праявы салідарнасці ў нашым грамадстве*”.

Шматлікія беларускія і міжнародныя арганізацыі, а таксама прадстаўнікі шэрагу дзяржаў заявілі пра палітычную матываванасць справы Алеся Бяляцкага і ўзмацненне пераследу грамадзянскай супольнасці. МЗС Беларусі назваў гэта “*прыкладам самага крывадушнага выкарыстання двайных стандартаў*”, бо “*прысуд суда не мае дачынення да праваабарончай дзейнасці асуджанага, а звязаны з яго ўхіленнем ад выплаты падаткаў*”. Заклікі адмяніць прысуд, заяўляюць у МЗС, дэманструюць “*выбарчы прававы нігілізм і проста цынізм іх аўтараў*”.

Між тым у Еўрасаюзе кажуць, што Бяляцкі папоўніў спіс палітвязняў. У адказ абвінаваўца і суддзя па гэтай крымінальнай справе ўжо фігуруюць як прэтэндэнты ў спіс неўязных у Еўрасаюз беларускіх чыноўнікаў.



На прысуд суда Першамайскага раёна Мінска ў Мінскі гарадскі суд накіраваная касацыйная скарга, але сам Алесь Бяляцкі ўжо адпраўлены ў турму ў Жодзіне. Яго можна падтрымаць, напісаўшы праваабаронцу на адрас:

***Бяляцкаму А. В.***
***вул. Савецкая, 22а, турма № 8,***
***Мінская вобл., г. Жодзіна,***
***222160***

# Лёс тэрарыстаў

**Вярхоўны суд Беларусі прызнаў Дзмітрыя Канавалава вінаватым у здзяйсненні тэракту ў мінскім метро 11 красавіка гэтага года, а Ўладзіслава Кавалёва – вінаватым у саўдзеле. Улічваючы іх выключную небяспеку для грамадства суд прысудзіў абодвух жыхароў Віцебска да смяротнага пакарання.**

Прысуд канчатковы і абскарджанню не падлягае. Змяніць зараз яго можа толькі прэзідэнт. Аднак той у сваіх публічных выступах не раз даваў зразумець, што Канавалаў і Кавалёў заслугоўваюць самага жорсткага пакарання. Дый за ўвесь час кіравання краінай ён памілаваў толькі аднаго асуджанага на смерць

Адвакаты Дзмітрыя Канавалава і Уладзіслава Кавалёва прасілі апраўдаць сваіх падабаронных, бо палічылі іх віну недаказанай. Яны звярталі ўвагу на шэраг супярэчнасцяў у пазіцыі абвінавачання, у тым ліку на мантаж відэа з камер назірання, якое дэманстравалася на судзе.

*Толькі 21% беларусаў вераць у тое, што злачынства было здзейснена тэрарыстам-адзіночкай і яго памагатым*

Што тычыцца грамадскай думкі, то па выніках вераснёўскага апытання НІСЭПД толькі 21% беларусаў вераць у тое, што злачынства было здзейснена тэрарыстам-адзіночкай і яго памагатым, за якімі ніхто не стаяў. Яшчэ 32% лічаць, што Канавалаў і Кавалёў датычныя да выбуху ў метро, але за імі стаялі нейкія заказчыкі. А 37% думаюць, што тэракт у мінскім метро – справа рук іншых людзей. За час судовага працэсу лічбы маглі змяніцца, бо справа неадназначная.

Між тым, незалежна ад таго, ці сапраўды пакаралі тых, хто ўчыніў тэракт, у Беларусі распачалася кампанія супраць смяротнага пакарання.

Праваабаронцы заяўляюць, што “*ніводная праваахоўная і судовая сістэма не застрахаваная ад памылак. Але судовыя памылкі не могуць быць выпраўленыя пасля прымянення смяротнага пакарання*”.

У заяве праваабаронцаў таксама гаворыцца, што смяротнае пакаранне бессэнсоўнае.

# “План Маршала” супраць ЕАС (працяг)

Пачатак на с.1

На жаль, магчымасці ЕС абмежаваныя – у параўнанні з Расіяй.

Як кажа старшыня Руху “За Свабоду” **Аляксандр Мілінкевіч**, “*у нашым рэгіёне было б нашмат прасцей абараняць еўрапейскія каштоўнасці, калі б Еўропа была больш моцнай і больш дынамічнай. На жаль, пагаршэнне сітуацыі з правамі чалавека ў нашай краіне супадае з глыбокім эканамічным крызісам у Еўропе*”.

“*Мае суайчыннікі, якія ў Беларусі змагаюцца за свае правы, глядзяць на Еўропу з вялікай надзеяй. Мы спадзяемся, што Еўрапейскі Саюз справіцца з эканамічнымі і сацыяльнымі цяжкасцямі, зноў набудзе дынамізм і веру ў сваю місію. Мы верым, што аднойчы мы аб’яднаемся – больш моцны, дынамічны Еўрапейскі Саюз і яго новыя члены, свабодныя краіны Ўсходняй Еўропы*”, – заявіў Мілінкевіч у Еўрапарламенце на нядаўняй сустрэчы лаўрэатаў прэміі імя Андрэя Сахарава “За свабоду думкі”.



“Мы верым, што аднойчы мы аб’яднаемся – больш моцны, дынамічны Еўрапейскі Саюз і яго новыя члены, свабодныя краіны Ўсходняй Еўропы”

*“План Маршала” – дастаткова ўмоўная назва, не літаральная. Так, сёння ў Еўрасаюза ёсць шмат іншых прыярытэтаў. Але гэта не азначае, што Беларусь на задворках і пра яе забыліся. Калі Беларусь пачне трансфармацыю, збліжэнне з цывілізаванымі краінамі, то можна будзе даволі хутка знайсці ахвотных падтрымаць гэты працэс. Зараз з боку Еўрасаюзу ідзе канцэптуальнае, стратэгічнае асэнсаванне таго, што ён можа зрабіць для дэмакратычнай Беларусі, для той Беларусі, якой патрэбная Еўропа*”, – спрагназаваў палітолаг, дарадца старшыні Руху **Алесь Лагвінец** на радыё “Свабода”.

Карысным, на ягоную думку, для пазітыўнага сігналу беларускаму грамадству быў бы не толькі “план Маршала”, але і аднабаковае змяншэнне коштаў шэнгенскіх віз і спрашчэнне працэдуры іх атрымання. Плюс – пашырэнне магчымасцяў для тых беларусаў, якія хочуць навучацца і легальна працаваць у Еўрасаюзе.

Натуральна, ужо клопат апазіцыйных сілаў унутры краіны – тлумачыць насельніцтву тое, якія інтарэсы Расіі хаваюцца за інтэграцыйнымі зніжкамі, і ў чым еўраальтэрнатыва.

Са словаў Аляксандра Мілінкевіча, галоўнае пытанне – што патрэбна Беларусі ў інтэграцыях? Мадэрнізацыя эканомікі. Хто можа дапамагчы нам у гэтым? Еўрапейскі саюз. Бо нават Расія, калі хоча мадэрнізавацца, звяртаецца да Еўрасаюзу.

А той самы газ патаннеей – гэта закансерваванне старой эканамічнай мадэлі з паглыбленнем залежнасці ад Расіі і падсілкаванне асабістай улады Лукашэнкі. Груба кажучы, цана ягонага чарговага тэрміну кіравання – “Белтрансгаз”. А ці гэта цана канчатковая?

Са словаў эканамічнага аналітыка **Сяргея Чалага**, Еўразійскі саюз – “*безумоўна, гэта палітычны праект Уладзіміра Пуціна. У яго зараз выбарчая кампанія, і тое, што зараз робіцца, гэта спосаб паказаць, што ён выпраўляе, як ён гэта называў, “галоўную геапалітычную катастрофу” стагоддзя – распад СССР*”. А з пункту гледжання эканомікі Чалы не верыць, што “*магчымыя нейкія раўнапраўныя эканамічныя саюзы з Расіяй – датуль, пакуль Расія разглядае танныя энерганосьбіты ўнутры сваёй краіны як сваю натуральную эканамічную перавагу і не разглядае гэтыя тавары як прадмет вольнага гандлю ва ўсіх гэтых эканамічных утварэннях*”.

Цытата ў пацвярджэнне з аднаго свежага інтэрв’ю расійскага амбасадара ў Мінску **Аляксандра Сурыкава**: “*У міждзяржаўных аб’яднаннях распаўсюджаная пазіцыя “адна краіна – адзін голас”. Але ў нас занадта розныя краіны – па насельніцтве, па тэрыторыі, па аб’ёмах вытворчасці, Расія – ядзерная дзяржава. Ну, як адна краіна – адзін голас?*”

Танны газ– гэта закансерваванне старой эканамічнай мадэлі з паглыбленнем залежнасці ад Расіі і падсілкаванне асабістай улады Лукашэнкі

P.S. У Беларусі сацыялагічных апытанняў, якія тычацца менавіта Еўразійскага саюза, пакуль не праводзілася. Але паколькі ў ім дамінуе Расія, то карэктна глядзець на дадзеныя, якія тычацца аб’яднання з ёй і ўступлення ў Еўрасаюз. Цяпер гэта практычна роўныя лічбы – адпаведна 41,5% і 42%.

Гэтай восенню Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў распытваў беларусаў наконт іх стаўлення да ўведзеных з 1 ліпеня новых, больш высокіх, мытаў на аўтамабілі, што ўвозяцца з Захаду, адпаведна ўмовам Мытнага саюзу.

Правільнай назвалі гэтую меру 17,6% апытаных, няправільнай, але шкода ад якой пераважваецца іншымі плюсамі Мытнага саюзу, – 37,8%. 21,9% з адказам не вызначыліся, а 22,7% лічаць, што Беларусі не варта быць у Мытным саюзе.

# Расійскія мільярды на АЭС

**Расія дае  10 мільярдаў доляраў крэдыту на будаўніцтва атамнай станцыі ў Астравецкім раёне.**

Грамадскія арганізацыі і ініцыятывы дзвюх краін зрабілі з гэтай нагоды заяву, што “*Расія, выкарыстоўваючы бядотнае эканамічнае становішча і аўтарытарную сістэму праўлення Беларусі, навязвае ёй свае небяспечныя і вельмі ненадзейныя тэхналогіі. Гэта адбываецца ў той час, калі ўсё большая колькасць краін свету адмаўляецца ад атамнай энергетыкі*”.

Нагадаем, Камітэт па выкананні Орхускай канвенцыі зрабіў афіцыйныя высновы пра парушэнне Беларуссю Канвенцыі пры рэалізацыі праекта ўзвядзення АЭС.


Чарнобыльскі Шлях Мінск, 26 красавіка 2010 г.

“*Гэты праект пабудовы АЭС не паляпшае энергетычнай бяспекі Беларусі. Як вядома, мы спажываем расійскія энергарэсурсы, і будаўніцтва атамнай станцыі паводле расійскага ўзору, з прыцягненнем расійскіх інвестыцыяў, расійскіх адмыслоўцаў прывядзе да таго, што мы будзем усё ж вымушаныя шукаць альтэрнатыўных шляхоў для нашай энергетычнай сістэмы*”, – упэўнены эколаг, кіраўнік мінскага аддзялення Руху “За Свабоду” **Юрась Меляшкевіч**.

Паводле яго словаў, беларуская атамная станцыя будзе крыніцаю небяспекі для навакольнага асяроддзя і людзей. “*Атамная станцыя небяспечная найперш праз адкіды, якія ўтвараюцца, і працяглы час гэтыя матэрыялы будуць захоўвацца на тэрыторыі станцыі*”, – *падкрэсліў эколаг-рухавец у сваім каментары па праблеме на “Белсаце*”.

# Без шуму, але з пылам

**Рух “За Свабоду” дамагаецца празрыстасці ў працэсе з’яўлення ў Беларусі прадпремстваў са шкоднай вытворчасцю.**



Так, Бярозаўскі райвыканкам адказаў на зварот кіраўніка аддзялення Руху “За Свабоду” ў Брэсцкай вобласці **Зміцера Траццяка** з нагоды таго, ці праводзіліся грамадскія слуханні аб арганізацыі ў Белаазёрску вытворчасці свінцу.

Яна павінна стаць адным з этапаў стварэння поўнага цыклу вырабніцтва ў Беларусі акумулятараў. Іх збіраюць у Пінску, але з вялікім імпартным складнікам.

У жніўні было абвешчана аб правядзенні грамадскіх слуханняў з нагоды магчымасці з’яўлення такога прадпрыемства. Але было незразумела – альбо яны не праведзены, альбо праведзены таемна. Таму Траццяк паслаў запыт у Бярозаўскі райвыканкам з патрабаваннем адказаць, дзе, калі і хто праводзіў гэтыя слуханні, калі наогул праводзіў.

Бярозаўскі райвыканкам паведаміў, што “*у сувязі з тым, што грамадскасць не звярнулася з заявай аб неабходнасці правядзення сходу па абмеркаванні справаздачы аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе аб’екта “Завод па вытворчасці свінцу і сплаваў” у мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы да 20 жніўня 2011 года, г.зн. на працягу 10 рабочых дзён з дня апублікавання паведамлення аб грамадскіх абмеркаваннях, сход па абмеркаванні справаздачы аб АУНА не праводзіўся*”.

“*Гэтым адказам выканаўчая ўлада паказвае сваё стаўленне да жыхароў горада. Калі трэба правесці які-небудзь “суботнік”, то людзей зганяюць ледзь не па прымусе, а што тычыцца абароны правоў грамадзян, то гэта, як аказваецца, справа саміх грамадзян*”, – кажа Зміцер Траццяк.

Актывісты Руху “За Свабоду” ў Белаазёрску будуць дамагацца ад уладаў правядзення грамадскіх слуханняў па пытанні адкрыцця такога завода. Дарэчы, у Бярозаўскім раёне гэта будзе ўжо другое прадпрыемства са шкоднай вытворчасцю. Раней было пабудавана прадпрыемства “Франдэса” па выпуску пестыцыдаў.

І супраць яшчэ адной шкоднай вытворчасці дапамагае змагацца беларусам Рух.

Пад зваротам да дэпутатаў усіх узроўняў з патрабаваннем не будаваць шкоднай вытворчасці ў цэнтры горада без экспертызы наступстваў падпісалася больш за тысячу жыхароў Бярозаўкі, што ў Лідскім раёне. Напісанне звароту да ўладаў ініцыявалі мясцовыя актывісты Руху “За Свабоду”. Яны арганізавалі і ўласна збор подпісаў.



Рэгіянальны кіраўнік Руху “За Свабоду” па Гродзеншчыне **Сяргей Трафімчык** кажа, што людзей вельмі абурае, што кіраўніцтва шклозавода “Нёман” хоча размясціць у цэнтры горада, на тэрыторыі завода, шкодную вытворчасць, не патлумачыўшы, якія ад гэтага могуць быць наступствы.

З яго слоў, большасць жыхароў гораду нават не падазрае, што такая вытворчасць можа месціцца побач з іхнімі дамамі. Працы па будоўлі цэху ўжо вядуцца.

# Еўраклубы – дзверы ў Еўропу

**“Клубіцца” можна па-рознаму” – так часопіс “Новая Еўропа” назваў артыкул пра дзейнасць Еўрапейскіх клубаў, арганізаваных Рухам “За Свабоду”. Моднае слэнгавае слова ўжытае, бо мэтавая аўдыторыя Еўраклубаў – моладзь.**

## Што такое Еўраклубы?

Гэта інфармацыйныя цэнтры і дыскусійныя пляцоўкі, якія займаюцца распаўсюдам інфармацыі пра Еўрапейскі саюз, кансультаваннем аб магчымасцях супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, турызму і бізнэсу. У межах іхняй дзейнасці запланавана правядзенне шэрагу тэматычных семінараў і дыскусіяў. Праект мае доўгатэрміновы характар, бо мэтай ёсць прышчапленне постаталітарнаму менталітэту ды яшчэ ва ўмовах неакаланіяльнага расійскага сацыякантэксту менавіта еўрапейскіх каштоўнасцяў, а не проста спажывецкіх еўрастандартавых выгодаў.

Немалаважна і тое, што гэта камунікацыя апанентаў уладаў, прасоўвальнікаў ідэі еўраінтэграцыі з народам на грунце пазітыўнай альтэрнатывы. Не даводзіцца, што як усё дрэнна ў Беларусі. Гаворыцца: “Давайце навучымся рабіць лепш!”. Прычым не вынаходзячы нейкія ровары, а пераймаючы еўрапейскі лад у тых



альбо іншых сферах.

## Што прапануюць Еўраклубы?

Еўраклубы даюць беларусам інфармацыю пра перавагі дэмакратычных стандартаў ў сацыяльнай сферы, дзяржаўным кіраванні і мясцовым самакіраванні. Нашы грамадзяне павінны мець магчымасць знаёміцца з апошнімі тэндэнцыямі ў культурным, эканамічным і грамадскім жыцці краін ЕС. Разам з тым гэта падрыхтоўка будучых уладных эліт.

*Еўрапейскія клубы – гэта не вынаходніцтва беларускай грамадзянскай супольнасці, а перайманне добрых традыцыяў нашых заходніх суседзяў, такіх як Польшча або Славакія*

Напрыклад, мінскі Еўраклуб ужо правёў кансультацыі для ахвотных навучацца ў Еўрасаюзе, прычым карысныя парады далі ўласна выпускнікі тамтэйшых універсітэтаў.

Запрацавала бібліятэка, фонд якой складаюць кнігі і мультымедыйныя дыскі, прысвечаныя еўрапейскай палітыцы, эканоміцы, гісторыі, турызму, спецыялізаваныя выданні еўрапейскіх структураў і амбасадаў, мастацкія альбомы, мапы Еўропы.

У мінскім Еўрапейскім клубе таксама зладзілі майстар-клас па модных сярод еўрасаюзаўскай моладзі экстрымальных відах спорту, абмеркавалі досвед пратэстаў у краінах ЕС, праведзены адкрыты конкурс на лагатып для ўсёй сеткі Еўраклубаў.

“Еўрапейскія клубы – гэта не чарговае вынаходніцтва беларускай грамадзянскай супольнасці, а перайманне добрых традыцыяў нашых заходніх суседзяў, такіх як Польшча або Славакія, што ўжо далучыліся да Еўрасаюзу. Але перад далучэннем у гэтых краінах існавала шчыльная сетка такіх клубаў, якія распаўсюджвалі інфармацыю пра ЕС, падтрымлівалі кантакты адно з адным і такім чынам паволі распаўсюджвалі ідэю аб’яднанай Еўропы сярод насельніцтва, асабліва моладзі”, – адзначае выданне “Новая Еўропа”.

Кіраўнікі клубаў хутка плануюць адукацыйны візіт у польскі Вроцлаў, каб павучыцца ў польскіх калег, як пашыраць і паляпшаць сваю працу і самі Еўраклубы.

# Стыпендыі на адукацыю

Новая стыпендыяльная праграма “Адкрытая Еўропа” (Open Europe Scholarship Scheme) дазволіць маладым беларусам адукавацца з атрыманнем ступені бакалаўра ці магістра ў еўрапейскіх універсітэтах. Праграму фінансуе ЕС, а ажыццяўляе Рада міністраў скандынаўскіх краін.

Прыярытэтнымі галінамі з’яўляюцца: права, эканоміка і сацыяльныя навукі, бізнэс-адукацыя, прыродазнаўства, медыцына, інжынерыя. Прымаюцца заяўкі і на іншыя спецыялізацыі.

Варта адзначыць, што заяўкі на паступленне ў абраны ўніверсітэт і на стыпендыю “Адкрытая Еўропа” падаюцца асобна.

Стыпендыя пакрывае выдаткі на навучанне, праезд і пражыванне ад пачатку да канца навучання. Стыпендыя складае 1000 еўра на месяц, яшчэ 800 (што праўда, на год) можна атрымаць на падарожжы.

Праграма адкрытая для ўсіх маладых беларусаў, якія адпавядаюць вызначаным акадэмічным, моўных і асобасным патрабаванням.

Падаючы новаму пакаленню беларускага грамадства магчымасць атрымаць якасную вышэйшую адукацыю, фундатары праграмы спадзяюцца “закласці падмурак для далей*шага дэмакратычнага развіцця Беларусі*”. Мяркуецца, што “*пасля заканчэння вучобы атрымальнікі стыпендый вернуцца ў Беларусь і ўнясуць сваё ўкладанне ў дэмакратызацыю краіны*”.

Падрабязнасці – на сайце стыпендыяльнай праграмы oess.eu.

# Замена матрыцы ВНУ

**З 1 верасня ўступіў у сілу Кодэкс аб адукацыі, які паставіў кропку, на думку кіраўніка дзяржавы, у рэфармаванні сістэмы адукацыі. Разам з тым заяўка на ўступленне ў Балонскі працэс Беларусі спараджае вялікую колькасць пытанняў. Рэформа вышэйшай школы – новая праблемная тэма кампаніі “Народная праграма” (Prahrama.by).**

Тое, што Беларусь – адзіная краіна ў Еўропе, якая не падпісала Балонскай дэкларацыі, не кажа аб тым, што трэба гэты пралом тэрмінова запоўніць. З той сістэмай вышэйшай адукацыі, якая існуе ў Беларусі, яшчэ не час штурмаваць Балонскі працэс, упэўнены **Зміцер Гаменюк**, дырэктар Цэнтра развіцця студэнцкіх ініцыятыў, студэнт бакалаўрскай праграмы “Міжнароднае права” ЕГУ.

Паводле ягоных словаў, асноўным довадам чыноўнікаў з Міністэрства адукацыі на карысць уступлення Беларусі ў Балонскі працэс з’яўляецца гатоўнасць дзяржавы перайсці на двухузроўневую сістэму навучання, наладзіць выпуск дадаткаў да дыплома еўрапейскага ўзору і ўвесці крэдытную сістэму: “*Укараненне крэдытнай сістэмы і дадатку да дыплома з’яўляецца хутчэй тэхнічным пытаннем, які Беларусь магла б вырашыць ужо даўно. Вылучэнне магістратуры ў асобную прыступку адукацыі (раней яна ўключалася ў аспірантуру) з’яўляецца пазітыўным новаўвядзеннем, якое так і не было якасна завершанае. Колькасць студэнтаў, якія паступаюць у магістратуру, не перавышае 5%, што кажа пра пэўныя праблемы ў гэтай галіне*”.

Самымі слабымі бакамі беларускай сістэмы вышэйшай адукацыі пры далучэнні да Балонскай сістэмы з’яўляюцца студэнцкая і выкладчыцкая мабільнасць, кантроль якасці адукацыі, уцягванне студэнтаў у кіраванне ВНУ, акадэмічныя свабоды і універсітэцкая аўтаномія, кажа Гаменюк.

“*Балонскі працэс – гэта як начны клуб, куды цяжка



патрапіць, але калі атрымаецца, то выйсці адтуль будзе больш складана. Менавіта таму разлічваць на якія-небудзь змены ў сістэме вышэйшай адукацыі можна напярэдадані уступлення ў Балонскі працэс, а не пасля*”, – адзначае эксперт.

На ягоны погляд, сістэма вышэйшай адукацыі Беларусі мае патрэбу ў фундаментальным рэфармаванні. Але тут узнікаюць два асноўныя пытанні: “*што рэфармаваць?*” і “*як рэфармаваць?*”.

Перыяд нерэфармаванасці, недарэфармаванасці сістэмы вышэйшай адукацыі ў Беларусі зацягнуўся – гэта тычыцца пераходу на рынкавыя прынцыпы, павышэння якасці адукацыі, дэбюракратызацыі ды іншага, зазначае кандыдат педагагічных навук **Святлана Мацкевіч**:

“*Урад заяўляе аб гатоўнасці далучыцца да Балонскага працэсу, адзначаючы, што асаблівых сур’ёзных змен не адбудзецца, тады як гэта прадугледжвае істотнае рэфармаванне. Гаворка вядзецца пра акадэмічныя свабоды, аўтаномны шлях развіцця ВНУ і іх адказнасць*”.

На думку Мацкевіч, Міністэрства адукацыі захапілася паляпшэннем матэрыяльна-тэхнічнай базы – па сутнасці, гэтым рэфармаванне і абмяжоўваецца: “*Тады як без адказаў застаюцца галоўныя пытанні: чаму мы навучаем і для чаго? Мэтай павінна стаць падрыхтоўка нацыянальнай эліты для развіцця краіны. Вельмі важна і тое, хто будзе кіраваць рэформамі? Каб не атрымалася так, як з рэформай сярэдняй школы, якая была прызнана няўдалай, а спытаць няма з каго?*”

Эксперт кажа, што для пачатку патрэбна канцэптуальная стратэгія рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі:

“*І кіраваць рэфармаваннем павінны не чыноўнікі, а адэкватныя мэнэджары. Вядучае звяно ў працэсе рэфармавання – акадэмічная супольнасць. Хоць і яна ў крызісе. Сёння акадэмічная супольнасць абмежаваная рознымі кіраўніцкімі нормамі, калі не застаецца магчымасцяў для творчасці, занятку навукай, свабоднага выкладання. Скажам, колькасць артыкулаў становіцца больш важнай, чымсьці іх змест.*

*Для пераадолення фармалізму і стагнацыі акадэмічнай супольнасці трэба даць свабоду, каб у тым ліку з’явілася новая генерацыя, каб вярталіся тыя, хто атрымаў еўрапейскую адукацыю. Дзяржава павінна проста не перашкаджаць*”.

Колішні прарэктар ЕГУ **Уладзімір Дунаеў** адзначае, што беларускія ВНУ першапачаткова ствараліся на грунце такой матрыцы, якая выключала інстытуцыйную аўтаномію і акадэмічную свабоду. І ў адрозненне ад суседніх краін, у якіх быў досвед дасавецкага акадэмічнага жыцця, Беларусь не атрымала нават такой слабой прышчэпкі ад дыктатуры. Працэс замены ўніверсітэцкай матрыцы, на ягоную думку, павінен працякаць у двух вымярэннях: у плане фармальнага рэфармавання нарматыўнай базы і ў плане праблематызацыі нефармальных мадэляў паводзінаў і матывацыі ўсіх удзельнікаў адукацыйнага працэсу, а таксама наступнага фармавання новай дэмакратычнай мадэлі паўсядзённай акадэмічнай дзейнасці.

# "Жыць няма за што"

**Супрацоўнікі сацыялагічнага цэнтра "Люстэрка-інфа" папрасілі ў лістападзе жыхароў Беларусі адказаць на пытанне аб тым, што сёння важнейшае – рост заробкаў і пенсій або барацьба з інфляцыяй?**



У выніку практычна роўная колькасць рэспандэнтаў выказалася як за павышэнне заробкаў (37%), так і за барацьбу з інфляцыяй (36%).

Сярод тых, хто прагаласаваў за падвышэнне заробкаў і пенсій больш за палову – жанчыны (58%). Прыкметна пераважаюць людзі 40 гадоў і старэй (62%), а таксама асобы з сярэдняй і ніжэй узроўнем адукацыяй (85%). У прафесійным плане больш за палову (55%) складаюць пенсіянеры, рабочыя і працаўнікі сельскай гаспадаркі. Як распавядаюць сацыёлагі, матывуючы сваё меркаванне, сельская пенсіянерка з сярэдняй адукацыяй з Віцебскай вобласці, напрыклад, піша: "*Жыць няма на што*".

Іншай думкі – аб тым, што сёння важнейшая барацьба з інфляцыяй, таму значна павышаць зарплаты і пенсіі не варта – больш актыўна прытрымліваюцца мужчыны. Кожны другі з прыхільнікаў гэтага меркавання – ва ўзросце да 40 гадоў. Пераважная большасць (95%) гэта асобы з сярэдняй і вышэй узроўнем адукацыяй. Пры гэтым кожны чацвёрты сярод іх – грамадзянін з вышэйшай адукацыяй (25%). У прафесійным плане больш інтэнсіўна выступаюць за барацьбу з інфляцыяй інжынерна-тэхнічныя работнікі і работнікі творчых прафесій (настаўнікі, юрысты, лекары і да т.п.), дзяржслужбоўцы і прадпрымальнікі.

Больш за палову (56%) тых, хто падзяляе меркаванне "жыць няма на што", пражываюць у малых гарадах і ў вёсцы. Сярод прыхільнікаў супрацьлеглага меркавання, якія заклікаюць больш актыўна змагацца з інфляцыяй, ледзь не дзве траціны – 62% рэспандэнтаў – гэта жыхары буйных (па колькасці жыхароў) гарадоў, абласных цэнтраў і Мінска.

Сацыёлагі адзначаюць, значная колькасць апытаных (27%) не змаглі адказаць на гэтае пытанне: "*Відавочна тэорыя ўступае ў канфлікт з жыццём. Веды – гэта, вядома, сіла, але жыць жа трэба цяпер*".

Дарэчы, у беларусаў засталося мала аптымізму. 30% кажуць, што наступным год будзе ў эканамічным плане хутчэй дрэнным, а 7% – адназначна дрэнным. Наадварот лічаць прыкладна столькі ж нашых суайчыннікаў: 33% – што хутчэй добрым будзе 2012-ы, 5% – дакладна добрым. А 25% не ведаюць чаго чакаць.

Можа, дадуць рады Дзед Мароз ці Зюзя? Бо на кіраўніцтва краіны надзеі небагата.

# Антыкрызісныя труны

**LJшны блогер Belnetmon апублікаваў сімптаматычнае фота – з рэкламкай продажу трунаў са зніжкай. Таму што "сацыяльна значная прадукцыя". У крызіс мо яно і так.**




BELNETMON.LIVEJOURNAL.COM

# Стоп-крызіс

**У Байнэце запрацаваў новы сайт Crisisby.net - інтэрактыўная пляцоўка для народнага маніторынгу крызісных з'яў у Беларусі.**

Кожны можа даслаць паведамленне, пакінуць спасылку на тэкст, фота ці відэа. Інфармацыя з'яўляецца ў выглядзе кропак на мапе.

Крызіс у першую чаргу бье па кішэні. Кошты растуць так хутка, што мы не пасяваем іх запомніць. Сэрвіс "*Народны барометр коштаў*" дапаможа прасачыць за зменамі коштаў на асноўныя тавары. Кожны інтэрнэт-карыстальнік можа даслаць кошт на тавар, і ён адлюструецца на інтэрактыўнай мапе коштаў Беларусі. А на форуме "*Базар*" можна напісаць сваё меркаванне ці ўзяць удзел у абмеркаванні актуальных крызісных тэмаў.

Газета выдаецца Рухам "За Свабоду". Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна.
Падпісана ў друк 30.11.2011 г. Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808863, e-пошта: info@pyx.by